УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»

УДК 069.01:[351.853+728.8](476)

**ГЕРАСІМЁНАК**
**Дзмітрый Васільевіч**

# МУЗЕЕФІКАЦЫЯ СЯДЗІБНА-ПАРКАВЫХ КОМПЛЕКСАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЯК СРОДАК АКТУАЛІЗАЦЫІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

**Аўтарэферат**
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата культуралогіі

па спецыяльнасці 24.00.03 – музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя
гісторыка-культурных аб’ектаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск, 2018

Навуковая работа выканана на кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

Навуковы кіраўнік: **Бяспалая Марыя Аркадзьеўна,**
доктар гістарычных навук, прафесар,
загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Афіцыйныя апаненты: **Гужалоўскі Аляксандр Аляксандравіч,**
доктар гістарычных навук, прафесар,
прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Джумантаева Тамара Аляксандраўна,**
кандыдат культуралогіі, дацэнт,
дырэктар навукова-даследчай і асветнай ўстановы культуры «Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік»

Апаніруючая арганізацыя: **Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»**

Абарона адбудзецца 07 чэрвеня 2018 г. а 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 пры ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» па адрасе: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала бібліятэкі ўніверсітэта; email: buk@buk.by; тэлефон вучонага сакратара: 222-83-06.

З дысертацыяй можна азнаѐміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

Аўтарэферат разасланы 07 мая 2018 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт А. Я. Корсакава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

У сучаснай сацыякультурнай сітуацыі, якая фарміруецца пад уплывам працэсаў глабалізацыі і характарызуецца парушэннем сувязей паміж чалавекам і лакальнай культурай, выключна востра паўстае пытанне аб захаванні гісторыка-культурнай спадчыны пэўнай краіны, рэгіёна ці грамадскай фармацыі. Менавіта культурная спадчына стварае падмурак для ідэнтыфікацыі індывіда, пераемнасці духоўнага вопыту продкаў, спрыяе аб'яднанню людзей у соцыуме. Асаблівую ўвагу на праблемы захавання і рацыянальнага выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны звяртае сусветная супольнасць, якая паступова прыйшла да ўяўлення, што аптымальнай формай захавання матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны з'яўляецца музейная прастора.

Прадметам дысертацыйнага даследавання з'яўляюцца сядзібна-паркавыя комплексы, якія належалі галоўным чынам сярэдняй шляхце і былі заснаваны ў XIX – пач. XX ст. Узровень іх матэрыяльнай і духоўнай культуры сведчыць аб пераходзе большасці беларускай шляхты, асабліва пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. да так званай арганічнай працы. Гэтая грамадзянская пазіцыя стварыла падмурак для росквіту сядзібнай культуры.

Актуальнасць тэмы даследавання звязана з узрастаннем інтарэсу грамадства і дзяржавы да прэзентацыі гісторыка-культурнай спадчыны і помнікаў сядзібна-паркавага мастацтва як яе часткі на рэгіянальным, рэспубліканскім, міжнародным узроўні. Пры савецкай уладзе сядзібна-паркавыя ансамблі разглядаліся як сведчанне буржуазнай (памешчыцкай, эксплуататарскай) культуры, не адпавядаючай нормам пралетарскай культуры. У грамадстве адсутнічала паняцце «гісторыка-культурная спадчына», яго замяняла вызначэнне «помнік гісторыі і культуры», якое ў большасці датычылася да аб'ектаў, што захоўвалі памяць пра рэвалюцыйнае мінулае і героіку класавай барацьбы.

Кардынальныя змены пачалі адбывацца пасля абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Аб гэтым сведчыць правядзенне мэтанакіраваных шырокамаштабных работ па аднаўленні магнацкіх і шляхецкіх сядзіб, іх музеефікацыі і папулярызацыі. Многія сядзібна-паркавыя комплексы выкарыстоўваюцца ў музейнай, турыстычнай, краязнаўчай дзейнасці, значная іх колькасць знаходзіцца пад аховай дзяржавы і ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Відавочна, што ў сучасным грамадскім усведамленні, а таксама заканадаўстве ў галіне культуры, замацавалася разуменне аксіялагічнага значэння гісторыка-культурнай спадчыны не толькі для сучаснага пакалення, але і для будучых, у сувязі з чым асаблівае значэнне набывае праблема навуковага асэнсавання і сістэматызацыі назапашанага вопыту з мэтай удасканалення працэсаў захавання, вывучэння і трансляцыі айчыннай культуры, папулярызацыі яе на міжнародным узроўні, арганічнага ўключэння ў актуальную сацыякультурную прастору.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі і тэмамі**

Дысертацыя выканана ў межах праграмы даследаванняў кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» па тэмах «Гісторыка-культурная спадчына Беларусі: вывучэнне, захаванне, трансляцыя» (№ ДР 20115713, зацверджана на Савеце ўніверсітэта 21.12.2010, пратакол № 4) і «Музеефікацыя гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: дасягненні і перспектывы» (№ ДР 20161947, зацверджана на Савеце ўніверсітэта 22.12.2015, пратакол № 4), а таксама выканання задання К-04 «Распрацаваць навукова-метадычныя рэкамендацыі ўкаранення сучасных музеязнаўчых тэхналогій у дзейнасць рэгіянальных музеяў Беларусі» па Дзяржаўнай праграме «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг. (пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 26.12.2010, № 1905).

**Мэта і задачы даследавання**

*Мэтай* дысертацыйнага даследавання з'яўляецца вызначэнне перспектыўных напрамкаў актуалізацыі сядзібна-паркавых комплексаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

У сувязі з пастаўленай мэтай у дысертацыйным даследаванні вырашаюцца наступныя *задачы*:

– удакладніць сутнасць і інстытуцыйнае вымярэнне паняццяў «сядзіба», «сядзібна-паркавы комплекс» і вызначыць іх нарматыўна-прававое замацаванне ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь аб культуры;
– раскрыць эвалюцыю, асноўныя прынцыпы аховы і музеефікацыі матэрыяльнай нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны;
– ахарактарызаваць сучасны стан сядзібна-паркавых комплексаў на тэрыторыі Беларусі і выпрацаваць універсальны падыход да іх сістэматызацыі;
– выявіць існуючыя формы і метады, а таксама напрамкі і фактары актуалізацыі сядзібнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

**Аб'ект і прадмет даследавання**

**Аб'ектам** дысертацыйнага даследавання з'яўляецца гісторыка-культурная спадчына Рэспублікі Беларусь, **прадметам** – сядзібна-паркавыя комплексы на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

**Навуковая навізна**

Навуковая навізна і тэарэтычная значнасць атрыманых вынікаў абумоўлена тым, што ў дысертацыі прадстаўлена сістэмнае даследаванне сядзібна-паркавых комплексаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у прыватнасці:

– вызначаны змест і суадносіны паняццяў «музей-сядзіба», «сядзібна-паркавы комплекс», «помнік сядзібна-паркавага мастацтва» ў арганізацыйна-інфармацыйнай сістэме матэрыяльнай нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- адлюстраваны гістарычныя этапы, базавыя характарыстыкі (сутнасць, змест, напрамкі, прынцыпы) аховы і музеефікацыі матэрыяльнай нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны;
- паказаны асноўныя заканамернасці фарміравання і развіцця сядзібна-паркавых комплексаў Беларусі ў залежнасці ад гістарычных і сацыякультурных умоў;
- абагульнены і сістэматызаваны сучасныя формы і метады захавання і актуалізацыі сядзібна-паркавых комплексаў.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Складанасць і шматграннасць такога культурнага феномена, як сядзібна-паркавы комплекс, патрабуе тэрміналагічнага ўдакладнення ў мэтах аптымізацыі нарматыўнага замацавання ў заканадаўчых актах і прававога рэгулявання яе аховы. У навуковай літаратуры сядзіба вызначаецца як *комплекс жылых, гаспадарчых пабудоў і помнікаў садова-паркавага мастацтва*, што з’яўляўся найбольш выразным культурным і эканамічным утварэннем на пэўным этапе грамадскага развіцця. Відавочна, што па-за ўвагай застаецца гістарычны і культурны аспекты азначанага феномена культуры, яго ўздзеянне на навакольнае асяроддзе.

Сядзібна-паркавы комплекс мае больш глыбокае напаўненне і значэнне і не абмяжоўваецца ўласна помнікамі архітэктуры і паркавага мастацтва. Сфармуляванае ў дысертацыйным даследаванні аўтарскае вызначэнне паняцця *«сядзібна-паркавы комплекс»*, пад якім разумееца *частка культурнага ландшафту, дзе спалучаюцца помнікі сядзібнай архітэктуры і садова-паркавага мастацтва пэўнай мясцовасці, значныя для захавання і прэзентацыі гісторыка-культурнай спадчыны свету, краіны або рэгіёна*, ўлічвае аксіялагічны, сацыякультурны і экалагічны кампаненты паняцця, дазваляе даследаваць сядзібна-паркавы комплекс як складаны аб’ект з выразным культурным і мастацкім значэннем.

2. Музеефікацыя як працэс пераўтварэння нерухомых помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны ў аб’екты музейнага паказу пачынаецца з зараджэння ідэі аб неабходнасці аховы помнікаў гісторыі і культуры. Цікавасць да гісторыка-культурнай спадчыны (перш за ўсё антычнай) можна прасачыць з эпохі Адраджэння. Першапачаткова гэта была грамадская дзейнасць заможных пластоў насельніцтва, якая грунтавалася на індывідуальным жаданні і ўсведамленні неабходнасці захаваць помнікі гісторыі і культуры для будучых пакаленняў. Назапашаны вопыт выкарыстоўваўся на розных этапах распрацоўкі дзяржаўнай палітыкі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў пазнейшыя часы і садзейнічаў фарміраванню культурнай памяці грамадства.

Эфектыўная музеефікацыя сядзібна-паркавых комплексаў грунтуецца на *прынцыпе рэстаўрацыі*, які ўлічвае прыярытэт аўтэнтычнасці нерухомых помнікаў, а таксама прыроднага асяроддзя як неад’емнай часткі цэласнага культурнага ландшафту, і адбываецца пры комплексным выкарыстанні метадаў *кансервацыі, рэстаўрацыі, фрагментарнай рэстаўрацыі* (аналітычны метад) і *цэласнай*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*рэстаўрацыі* (сінтэтычны метад), захавання, узнаўлення мастацка-архітэктурных інтэр'ераў, прыроднага акружэння, інтэрпрэтацыі з дапамогай экспазіцый, выстаў, тэатралізаваных экскурсій і інш.

3. Праблематыка сучаснага стану сядзібна-паркавых комплексаў на тэрыторыі Беларусі неад'емна звязана з рэтраспектывай сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця краіны. Формы і метады актуалізацыі спадчыны праз інтэрпрэтацыю і прэзентацыю сядзібнай культурнай прасторы залежаць ад маральна-каштоўнасных норм, існуючых у грамадстве ў пэўную гістарычную эпоху.

Сядзібна-паркавыя комплексы Рэспублікі Беларусь увасоблены ў помніках нерухомай культурнай спадчыны розных па стане захаванасці і ступені ўвагі дзяржавы і грамадства, што адбіваецца на складанасці іх абагульнення і сістэматызацыі. Прааналізаваныя матэрыялы даследавання дазваляюць класіфікаваць сядзібна-паркавыя комплексы як аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны ў залежнасці ад узроўню навуковай і мастацкай каштоўнасці, існуючай захаванасці і прыстасаванасці, магчымасцей музеефікацыі і прэзентацыі, прыцягальнасці для наведвальнікаў, што ў сваю чаргу дае падставы вызначыць прыярытэтныя з іх для ўключэння ў сучасную сацыякультурную прастору Рэспублікі Беларусь і ажыццявіць іх мэтанакіраванае ўвядзенне ў актуальную культуру.

4. Перспектывы актуалізацыі сядзібна-паркавых комплексаў на тэрыторыі Беларусі грунтуюцца на ўжыванні шырокага спектра традыцыйных і пошуку новых шляхоў па далейшым удасканаленні працэсу музеефікацыі. Пры выкарыстанні гістарычных сядзіб пад патрэбы экскурсійнага паказу больш увагі надаецца не толькі навуковай каштоўнасці азначаных помнікаў гісторыі і культуры, напрыклад архітэктурным асаблівасцям, але і пытанням сацыяльнай і культурнай прывабнасці таго пласта матэрыяльнай і духоўнай культуры, які непарыўна звязаны з насельнікамі сядзібы, мемарацыяй іх грамадскай дзейнасці і асабістага жыцця, светапогляду, побыту і г. д. і іх уплывам на фарміраванне гістарычнай і культурнай памяці соцыуму.

Вызначэнне *фактараў актуалізацыі* сядзібна-паркавых комплексаў на тэрыторыі Беларусі дазваляе вылучыць перспектыўныя кірункі прэзентацыі назапашанага інфармацыйнага патэнцыялу помнікаў сядзібна-паркавага мастацтва сродкамі музейнай і турыстычнай дзейнасці. Пошукі магчымасцей рашэння гэтай праблемы цесна звязаны з сацыякультурнай сітуацыяй у сучасным грамадстве, гатоўнасцю прыйсці да разумення значнасці пастаўленых пытанняў, таго, што сядзіба можа стаць сацыякультурным цэнтрам, які будзе актыўна ўплываць на фарміраванне культурнага іміджу краіны, рэгіёна ці пэўнай лакальнай мясцовасці.

Пры ўключэнні нерухомых аб'ектаў у сацыякультурнае асяроддзе ўжываюцца спецыфічныя метады актуалізацыі сядзібнай спадчыны: *рэканструкцыя* (частковая рэканструкцыя і поўная – «на аптымальную дату», г. зн. перыяд жыцця ў сядзібе мемаруемай асобы), *фіксацыя, мадэляванне, канструяванне і рэвіталізацыя*. Пры розных формах актуалізацыі спадчыны ў адносінах да канкрэтных яе відаў могуць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прымяняцца любыя з пазначаных метадаў; у залежнасці ад пэўных умоў і фактараў пераважаць той ці іншы.

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыйнае даследаванне з'яўляецца самастойна выкананай работай, у якой прааналізаваны сучасны стан і выяўлены перспектыўныя формы трансляцыі ў актуальную сацыякультурную прастору такой сінкрэтычнай культурнай формы, як сядзібна-паркавы комплекс. На падставе архіўных матэрыялаў, манаграфічных даследаванняў, натурных назіранняў, вывучэння заканадаўчай базы былі вызначаны эвалюцыя, асноўныя напрамкі, этапы і прынцыпы, а таксама даследаваны практычныя вынікі айчыннага вопыту музеефікацыі і сувязь дадзенага працэсу з аховай гісторыка-культурнай спадчыны. Аўтарам даследавання прапанавана ўласнае вызначэнне паняцця «сядзібна-паркавы комплекс», праведзена сістэматызацыя азначаных комплексаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, зроблены прапановы па ўдасканаленні іх захавання і актуалізацыі.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні даследавання адлюстраваны ў публікацыях і выступленнях на навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, у тым ліку: І Міжнароднай канферэнцыі памяці Я. Д. Грыгаровіч «Асоба ў кантэксце сучасных сацыякультурных працэсаў» (Мінск, 2014 г.), навуковых канферэнцыях прафесарска-выкладчыцкага складу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў «Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва» (Мінск, 2014, 2015, 2016 і 2017 гг.), XL, XLI і XLII выніковых навуковых канферэнцыях студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў «Нацыянальная культура вачыма маладых» (Мінск, 2015, 2016, 2017 гг.), IX, X і XI Міжнародных навукова-практычных канферэнцыях «Культура. Навука. Творчасць» (Мінск, 2015, 2016 і 2017 гг.), XXI, XXII і XXIII Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях, прысвечаных Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 2015, 2016 і 2017 гг.), навукова-практычнай канферэнцыі «VI Тышкевіцкія чытанні: гісторыка-культурная спадчына Свіслацкага краю (да 760-годдзя горада Свіслач)» (Свіслач, 2016 г.), V навуковай канферэнцыі «Музеялогія – музеязнаўства ў XXI стагоддзі: праблемы вывучэння і выкладання» (Санкт-Пецярбург, 2016 г.), навуковай канферэнцыі «Музеефікацыя каралеўскіх, магнацкіх, шляхецкіх рэзідэнцый і сядзіб» (Гродна, 2017 г.), музейных чытаннях ў рамках экспазіцыі «Беларусь: адраджэнне духоўнасці» і з нагоды 50-годдзя адкрыцця экспазіцыі Дзяржаўнага музея БССР (Мінск, 2017 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Вынікі даследавання знайшлі адлюстраванне ў 11 публікацыях аўтара, 3 з якіх апублікаваны ў навуковых рэцэнзаваных часопісах, 4 артыкулы – у навуковых зборніках, 3 – у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый, 1 – вучэбная праграма. Агульны аб'ём публікацый складае 3,4 аўтарскіх аркушаў, з якіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1,5 аўтарскіх аркушаў апублікавана ў выданнях, уключаных у пералік навуковых выданняў ВАК Рэспублікі Беларусь.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Структура дысертацыі змяшчае ўводзіны, агульную характарыстыку работы, асноўную частку, якая складаецца з трох раздзелаў, заключэнне, бібліяграфічны спіс, 10 дадаткаў і 2 акты ўкаранення. Поўны аб'ём дысертацыі складае 139 старонак, з іх 104 старонкі займае асноўны тэкст, 18 старонак – бібліяграфічны спіс (181 выкарыстаная крыніца) і спіс публікацый аўтара (11 найменняў), 17 старонак займаюць дадаткі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

***Ва ўводзінах і агульнай характарыстыцы работы*** абгрунтаваны выбар тэмы даследавання, яе актуальнасць; вызначаны мэта, задачы, навуковая навізна даследавання; сфармуляваны асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону; прадстаўлены звесткі аб апрабацыі і апублікаванасці вынікаў даследавання, а таксама аб структуры і аб'ёме даследавання.

У ***главе 1 «Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання»*** акрэсліваюцца тэарэтычныя палажэнні і базавыя паняцці, якія датычацца прадмета дысертацыйнай работы. ***Раздзел 1.1 «Аналітычны агляд літаратуры і метадалогія даследавання»*** дазваляе зрабіць выснову, што для праведзенай навуковай работы маюцца аргументаваныя падставы, таму што пытанні музеефікацыі нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны падымаліся толькі ў нешматлікіх работах. У прыватнасці, амаль не разглядаліся праблемы суадносін тэрміналагічнага зместу вызначэнняў «помнік гісторыі і культуры» і «гісторыка-культурная спадчына», іх сацыяльная і культурная значнасць, неабходнасць заканадаўчага замацавання актуалізацыі спадчыны.

У падмурак аналізу выкарыстанай навуковай літаратуры пакладзены прынцып падзелу яе на тры групы згодна музеязнаўчага значэння (тэорыя музеефікацыі; ахова гісторыка-культурнай спадчыны; практыка музеефікацыі).

Цікавасць навуковай супольнасці да аховы помнікаў гісторыі і культуры прасочвалася з сярэдзіны ХІХ – пачатку ХХ ст. і праяўлялася ў гісторыка-мастацкіх назіраннях, а затым гісторыка-археалагічных і мастацтвазнаўчых пошуках Ф. Ф. Гарнастаева, І. Я. Забеліна, Г. К. Лукомскага, І. М. Снегірова і інш. Вызначаныя напрацоўкі былі пакладзены ў аснову тагачаснага заканадаўства па ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

Тэрмін «музеефікацыя» ўжываўся пераважна прадстаўнікамі савецкай музеязнаўчай школы; дэфініцыя была ўведзена ў навуковы ўжытак у 1920-я гг. савецкім даследчыкам Ф. І. Шмітам. На працягу ХХ ст. адбываецца працэс удасканалення сутнасці гэтага паняцця. Агульныя палажэнні аб музейным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстанні нерухомых помнікаў адлюстраваны ў работах В. В. Аурава, А. С. Давыдавай, А. У. Іконнікава і інш.

На сучасным этапе пытанні, прысвечаныя асобным аспектам музеефікацыі як асноўнага напрамку музейнай дзейнасці, закранаюцца ў абагульняючых працах М. Е. Каўлен, Э. А. Шулепавай, Т. Ю. Юрэневай, С. І. Сотнікавай. Узаемаадносіны музея і грамадства разглядаюць В. С. Сапанжа, А. І. Смолік, А. А. Сундзіева, Л. М. Шляхціна, В. М. Сакалова і інш.

Беларускія даследчыкі фрагментарна вывучаюць развіццѐ сядзібна-паркавых комплексаў на тэрыторыі Беларусі. У асноўным яны засяроджваюць увагу на буйных помніках палацава-паркавага мастацтва і гісторыі іх развіцця (В. Д. Бажэнава, Н. Ф. Высоцкая, А. М. Кулагін), эвалюцыі сядзібнага будаўніцтва пераважна на тэрыторыі Заходняй Беларусі (А. П. Федарук, Л. М. Несцярчук), але пытанні музеефікацыі азначаных помнікаў матэрыяльнай культуры практычна не закранаюць.

У раздзеле 1.1 вызначаны *метадалагічныя прынцыпы* і *падыходы* да даследавання. Базавым інструментам вывучэння паслужыла сукупнасць агульнанавуковых (аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя), культуралагічных, канкрэтна-гістарычных (гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалагічны) *метадаў*.

*Прынцып гістарызму* прадугледжваў разгляд прадмета даследавання ў развіцці. Дзякуючы яму былі выяўлены перадумовы і асноўныя этапы аховы помнікаў сядзібна-паркавага мастацтва, развіцця тэорыі і практыкі музеефікацыі.

*Прынцыпы аб'ектыўнасці і цэласнага* падыходу, на якіх грунтаваўся аналіз значнай колькасці эмпірычнага матэрыялу, дазволілі атрымаць навукова абгрунтаваныя, аргументаваныя высновы дзякуючы сінтэзу шматпланавай інфармацыі, яе крытычнай ацэнцы, арыентацыі на сучасны ўзровень ведаў па прадмеце даследавання. *Сістэмны прынцып* дапамог вызначыць крытэрыі сістэматызацыі сядзібна-паркавых комплексаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

*Культуралагічны падыход* дазволіў пераадолець фрагментарнасць даследаванняў, прысвечаных музейнай камунікацыі, што распрацоўваюцца на ўзроўні асобных (прыкладных) тэхналогій; спрыяў вывучэнню сядзібна-паркавага комплексу як феномена культуры, які мае ўласцівую яму структуру і валодае пэўнымі функцыямі. Выкарыстанне *аксіялагічнага* і *семіятычнага падыходаў* дапамагло прыйсці да высновы, што кожны элемент у сядзібна-паркавым комплексе нясе знакавую і сэнсавую каштоўнасць. *Інстытуцыянальны падыход* дазволіў вызначыць механізм прававога рэгулявання аховы помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны.

*Метад назірання* ўжываўся пры палявым вывучэнні сядзібна-паркавых комплексаў у іх натуральным асяроддзі, вызначэнні ўзроўню іх захаванасці і практыкі выкарыстання. Экспедыцыі па рэгіѐнах Рэспублікі Беларусь, наведванне і фотафіксацыя сядзіб Гомельскага, Веткаўскага, Хойніцкага, Браслаўскага і іншых раѐнаў сталі дадатковай крыніцай інфармацыі па тэме даследавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У ***раздзеле 1.2 «Тэарэтычныя падыходы і практыка музеефікацыі помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны»*** канстатуецца, што музеефікацыя непасрэдна залежыць ад жадання грамадства да ўспрыняцця гісторыка-культурнай спадчыны і з'яўляецца важным напрамкам музейнай дзейнасці, адметнай рысай якога становіцца пераўтварэнне ў аб'екты музейнага паказу як нерухомых помнікаў (архітэктурных збудаванняў і ансамбляў, помнікаў садова-паркавага мастацтва і да т. п.), так і гісторыка-культурнага асяроддзя, іх прэзентацыя і інтэрпрэтацыя.

Аўтар дысертацыйнага даследавання зыходзіць з пункту гледжання, што ахова помнікаў гісторыі і культуры – гэта папярэднік і галоўная ўмова музеефікацыі. Распрацоўкі ў галіне аховы матэрыяльнай нерухомай спадчыны закладваюць стаўленне да музеефікацыі як да часткі музейнай практыкі і дазваляюць прыйсці да яе разумення ў якасці важнага і перспектыўнага напрамку дзейнасці па актуалізацыі сядзібна-паркавых комплексаў.

Практыка музеефікацыі складваецца пазней іншых кірункаў культурнай дзейнасці, якія з'яўляюцца пэўнымі этапамі работы з рухомай матэрыяльнай спадчынай (вылучэнне і адбор з асяроддзя бытавання, захаванне, даследаванне, прэзентацыя і інтэрпрэтацыя сродкамі музейнай экспазіцыі). Музеефікацыя нерухомай матэрыяльнай спадчыны ўключае вышэйадзначаныя этапы, але экспазіцыя можа служыць дапаўненнем, ілюстрацыяй да паказу інтэр'еру ці экспанавання пад адкрытым небам нерухомых аб'ектаў. Перш за ўсё ўвага звяртаецца на камунікацыю з музейнай аўдыторыяй, папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны.

Можна вылучыць два асноўныя кірункі музеефікацыі. Першы пачынаецца са старажытных часоў (у дзяржавах Старажытнага свету і Антычнасці) і праяўляецца ў стварэнні музейнага асяроддзя шляхам калекцыяніравання рухомых прадметаў музейнага значэння, стварэння протамузейных збораў, на аснове якіх узнікаюць музеі. Другі кірунак (XVIII ст.) звязаны са спробамі музеефікацыі комплексных нерухомых помнікаў на месцы іх бытавання (Геркуланум, Пампеі).

Фарміраванне музеальнасці ў сядзібах еўрапейскай арыстакратыі прасочваецца з XVI ст. Ствараюцца мемарыяльныя пакоі і кабінеты, палацава-паркавыя комплексы дэманструюцца гасцям. У 1842 г. у Лагойскім маёнтку К. і Я. Тышкевічамі заснаваны музей старажытнасцей (першы на тэрыторыі Беларусі публічны музей). У XX ст. з'яўляюцца першыя мемарыяльныя музеі ў дамах і сядзібах выдатных дзеячаў гісторыі, мастацтва і культуры.

У выніку даследавання вызначаны спосабы ўключэння матэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў сучасную сацыякультурную прастору. Канстатуецца, што пры падрыхтоўцы сядзібна-паркавага комплексу да дэманстрацыі ў якасці самастойнага аб'екта яго музеефікацыя пачынаецца з правядзення рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ. Сучасная практыка стварэння музейнай прасторы ўключае вывучэнне, кансервацыю і рэстаўрацыю, захаванне ці аднаўленне мастацка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

архітэктурных або гісторыка-побытавых інтэр’ераў, а таксама прыроднага і гісторыка-культурнага асяроддзя.

*Кансервацыя* – часовае альбо доўгатэрміновае забеспячэнне захаванасці наяўнага стану аб’екта – прадугледжвае замацаванне каштоўнасці помніка з усімі наслаеннямі, якія з’явіліся за час яго існавання (*сядзібы Рэйтанаў* у в. Грушаўка, *Войніч-Сенажэцкіх* у в. Хальч). *Фрагментарная рэстаўрацыя* (аналітычны метад) дапускае ўнясенне нязначных змяненняў: на першым этапе здзяйсняецца раскрыццѐ помніка – выдаляюцца пазнейшыя элементы, якія не нясуць гістарычнай каштоўнасці; на другім – ажыццяўляецца аднаўленне страчаных элементаў (*музей-сядзіба М. К. Агінскага* ў аг. Залессе, *сядзіба Булгакаў «Добасна»* у аг. Жылічы). *Цэласная рэстаўрацыя* (сінтэтычны метад) дазваляе ўзнавіць «аптымальнае» аблічча помніка (*музей-сядзіба Козел-Паклеўскіх* у аг. Красны Бераг, *музей-сядзіба І. Я. Рэпіна «Здраўнѐва»* ў в. Койтава).

Сярод сучасных форм захавання сядзібнай спадчыны вылучаюцца такія, як фіксацыя (*Лошыцкі сядзібна-паркавы комплекс* у г. Мінск), частковая рэканструкцыя (гісторыка-мемарыяльны *музей «Сядзіба Няміэвічаў»* у в. Скокі) і поўная рэканструкцыя – «на аптымальную дату» (*музей-сядзіба «Пружанскі палацык»* у г. Пружаны), мадэляванне (мемарыяльны *музей-сядзіба Т. Касцюшкі* ва ўрочышчы Мерачоўшчына), канструяванне (*музей-сядзіба Ф. Багушэвіча «Кушляны»*) і рэвіталізацыя (*музей-сядзіба Міцкевічаў «Завоссе»*).

Мерапрыемствы па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ўяўляюць складаную ўзаемазвязаную сістэму. Музеефікацыя з’яўляецца яе завяршальнай стадыяй, якая дазваляе ажыццявіць пераход ад рэвіталізацыі да актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны.

У ***главе 2 «Ахова сядзібна-паркавых комплексаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь»*** падкрэсліваецца першараднае значэнне захавання азначаных аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў сучасным сацыякультурным асяроддзі.

У ***раздзеле 2.1 «Дзяржаўная палітыка ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны»*** разглядаецца механізм прававога рэгулявання аховы помнікаў: парадак рэгістрацыі, класіфікацыі і занясення ў рэестры, якія маюць сілу юрыдычнага акта; ад вызначэння аб’екта аховы да прававой рэгламентацыі спрэчных пытанняў аднаўлення, утрымання, выкарыстання і захавання гісторыка-культурных каштоўнасцей.

На тэрыторыі Беларусі працэс захавання нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны адбываўся ў рэчышчы прававой палітыкі Расійскай імперыі, якая не мела асобнага заканадаўства, прысвечанага ахове помнікаў, аднак у ѐй дзейнічалі пастановы, указы, цыркуляры міністэрстваў па зборы сведчанняў аб рэштках старажытнасці (1826, 1848, 1866, 1877, 1882, 1903 гг.). У акрэслены перыяд былі вызначаны органы дзяржаўнай улады з неабходнымі паўнамоцтвамі, сфарміравана

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сістэма навуковых таварыстваў, было санкцыянавана стварэнне грамадскіх арганізацый.

Заканадаўства па ахове гісторыка-культурнай спадчыны як сістэма прававых норм пачало фарміравацца пасля рэвалюцыі 1917 г. У перыяд савецкай дзяржаўнасці ахова помнікаў БССР рэгулявалася саюзным (1922–1991 гг.) і рэспубліканскім заканадаўствам аб культуры. На тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) ахова гісторыка-культурнай спадчыны адбывалася ў рэчышчы польскай дзяржаўна-прававой палітыкі.

У сучасным беларускім заканадаўстве гісторыка-культурнай спадчынай прызнаюцца аб'екты, якія маюць гістарычную, культурную і мастацкую значнасць. Прававое рэгуляванне адносін у сферы аховы і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь забяспечваецца ў першую чаргу згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры. Юрыдычнае прызнанне спадчыны ў якасці гісторыка-культурнай каштоўнасці адбываецца шляхам уключэння ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. У справе захавання айчыннай спадчыны важнае значэнне надаецца міжнародным дамовам і пагадненням.

У ***раздзеле 2.2 «Сядзібна-паркавыя комплексы як частка гісторыка-культурнай спадчыны: вызначэнне паняцця, станаўленне, аксіялагічная сутнасць»*** выяўлены заканамернасці эвалюцыі сядзібнай культурнай прасторы Беларусі, якая характарызуецца не толькі зменай мастацкіх стыляў, але і спецыфікай сацыякультурнага жыцця. Пры вывучэнні сядзібнага-паркавага комплексу як артэфакта культуры разглядаюцца яго аксіялагічныя аспекты – сімволіка архітэктурнага і садова-паркавага мастацтва ў залежнасці ад каштоўнасных уяўленняў у розныя эпохі.

Узнікненне сядзіб на тэрыторыі Беларусі было звязана з імкненнем заможнай шляхты пераняць лад жыцця кіруючай эліты, выразна прадэманстраваць грамадскі статус свайго роду. Фарміраванне мастацкіх асаблівасцей беларускіх сядзібна-паркавых комплексаў праходзіла ў рэчышчы развіцця агульнаеўрапейскай культуры з улікам мясцовых традыцый, гістарычных і сацыяльна-эканамічных умоў, а таксама ладу жыцця, эстэтычных густаў уладальнікаў.

Складанасць і шматграннасць разглядаемага культурнага феномена абумовілі цяжкасці пры вызначэнні дэфініцыі. Сядзібна-паркавы комплекс можа выступаць як *помнік архітэктуры*, таму што дадзеныя аб'екты могуць быць асобнымі або аб'яднанымі ў комплексы і ансамблі, у іх склад могуць уваходзіць творы выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога, садова-паркавага мастацтва; як *запаведная мясціна*, таму што ѐн з'яўляецца асобным, тапаграфічна акрэсленым комплексам аб'ектаў дойлідства і пейзажнага ландшафту, якія створаны шляхам узаемадзеяння чалавека і прыроды; як *помнік гісторыі*, таму што на яго тэрыторыі маглі адбывацца значныя гістарычныя падзеі, якія былі звязаны як з развіццѐм грамадства і дзяржавы, навукі і тэхнікі, культуры і г. д., так і з сацыякультурнай эвалюцыяй канкрэтнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэгіёна. На думку даследчыка, перш за ўсѐ павінны ўлічвацца гісторыка-культурная прастора і яе асноўная частка – сядзібны культурны ландшафт.

Культурны ландшафт сядзіб фарміраваўся пад уплывам мастацкага густу гаспадара, адлюстроўваў стылѐвыя асаблівасці свайго часу і быў цесна звязаны з разнастайнымі відамі мастацтва. Шматлікія помнікі матэрыяльнай культуры былі пабудаваны па праектах вядомых архітэктараў свайго часу. Вакол сядзіб не толькі ствараліся пейзажныя паркі, штучныя вадаѐмы (*сядзіба Патоцкіх* у аг. Высокае), але і ўвогуле змяняўся навакольны ландшафт.

У залежнасці ад спосабу фарміравання і эвалюцыі сядзібныя культурныя ландшафты падзяляюцца на тыпы: створаныя па задуме чалавека (*сядзіба Чапскіх* у в. Прылукі), натуральна сфарміраваныя (*сядзіба Ваньковічаў* у Сляпянцы, г. Мінск), асацыятыўныя (*сядзіба Н. Орды* у в. Варацэвічы).

Асэнсаванне каштоўнаснай сутнасці сядзібна-паркавых комплексаў звязана з духоўным пераломам ва ўяўленнях аб былых сядзібах як помніках варожай культуры эксплуататараў і пераходам да разумення аксіялагічнага значэння гісторыка-культурнай спадчыны. Для таго, каб вылучаць сядзібна-паркавыя комплексы як частку гісторыка-культурнай спадчыны, неабходна прымаць да ўвагі і асаблівае значэнне гістарычнай і культурнай памяці, якая праяўлялася ў матэрыяльнай і нематэрыяльнай сферах жыццядзейнасці былых уладальнікаў сядзіб на пэўнай тэрыторыі.

У ***раздзеле 2.3 «Сістэматызацыя сядзібна-паркавых комплексаў Беларусі»*** прааналізаваны існуючыя і прапанаваны аўтарскі варыянт сістэматызацыі сядзібна-паркавых комплексаў на тэрыторыіі краіны.

Першасная сістэматызацыя азначаных помнікаў гісторыі і культуры можа быць заснавана на формах вытворчай арганізацыі (сядзібы, фальваркі), уласнасці (дзяржаўныя, прыватнаўласніцкія), архітэктурных стылях, матэрыялах пабудовы, часе стварэння таго ці іншага сядзібна-паркавага комплексу, ступені яго захаванасці і г. д.

Адзначаецца, што сістэматызацыя, прапанаваная Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, грунтуецца на мастацка-эстэтычнай, гістарычнай каштоўнасці для грамадства помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны, але сядзібна-паркавыя комплексы прадстаўлены ў ѐй фрагментарна. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь уключае 173 комплексы, у якім аб’ектам матэрыяльнай спадчыны прысвойваюцца розныя катэгорыі: нулявая (сусветны ўзровень), першая (міжнародны), другая (рэспубліканскі) і трэцяя (рэгіянальны – лакальны, мясцовы). Аб’екты трэцяй катэгорыі, згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры, знаходзяцца ў распараджэнні мясцовых органаў улады. У параўнанні з Дзяржаўным спісам база даных партала «Глобус Беларусі» (прыватны праект А. Дыбоўскага) утрымоўвае звесткі аб 1110 сядзібах. Пры яе складанні выкарыстаны матэрыялы палявых даследаванняў, навуковыя крыніцы, грамадская думка і інш. звесткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры распрацоўцы аўтарскай сістэматызацыі ўлічваліся наступныя важнейшыя характарыстыкі сядзібна-паркавых комплексаў: навуковая каштоўнасць, аксіялагічная значымасць, ступень захаванасці і прыстасаванасці, магчымасці прэзентацыі і папулярызацыі, што дазваляе мэтанакіравана ўключаць азначаныя помнікі гісторыка-культурнай спадчыны ў актуальную культуру. Існуючыя сядзібна-паркавыя комплексы можна сістэматызаваць наступным чынам:

1. Сядзібна-паркавыя комплексы, прыдатныя для актуалізацыі былых пластоў матэрыяльнай і духоўнай культуры, на аснове якіх можна стварыць (ці ўжо створаны) музеі. Адзначаецца, што такія сядзібы рэальна ў кароткі тэрмін прывесці да музеефікаванага стану і гэта стварыла б шырокія магчымасці раскрыцця назапашанага ў іх гісторыка-культурнага патэнцыялу. Дадзеная група падзяляецца на дзве падгрупы (адпаведна А і Б). Да падгрупы «А» адносяцца сядзібна-паркавыя комплексы, у якіх на сённяшні момант размяшчаюцца музейныя ўстановы (*в. Германавічы, в. Здраўнёва, в. Залессе* і інш.). Сядзібы падгрупы «Б» функцыянуюць як адміністрацыйныя, рэкрэацыйныя і рэлігійныя ўстановы (*г. Бешанковічы* – школа мастацтваў, *в. Межава* – праваслаўны храм, *г. Валожын* – дзяржаўныя арганізацыі), што дазваляе падтрымліваць помнікі ў належным выглядзе.

2. Помнікі са значным гісторыка-культурным патэнцыялам (*в. Бачэйкава, в. Двор-Нізгалава, в. Відзы-Лаўчынскія, в. Барысаўшчына, в. Шчорсы* і інш.). Дадзеная група можа быць уключана ў сферу музейных інтарэсаў такім жа чынам, як і першая, аднак патрабуе значных фінансавых капіталаўкладанняў (рэстаўрацыя і аднаўленне помнікаў). Актуалізацыю можна ажыццявіць уключэннем помнікаў у турыстычныя маршруты ці шляхам правядзення тэматычных мерапрыемстваў.

3. Ансамблі помнікаў сядзібна-паркавага мастацтва, якія не захаваліся да нашага часу (*в. Дабрыгоры, в. Ахрэмаўцы, в. Вазгелянцы, в. Даўблі, в. Заляддзе* і інш.). Пры прэзентацыі дадзеных помнікаў гісторыі і культуры існуюць пэўныя складанасці, абумоўленыя станам іх захаванасці (засталіся рэшткі сядзібнага дома, руіны гаспадарчых пабудоў ці фрагменты парку). Гэтая група, па сутнасці, выключана з інфармацыйнай прасторы грамадства, аднак памяць пра існаванне дадзеных помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны можа падтрымлівацца ці праз аднаўленне (як, напрыклад, *сядзіба Міцкевічаў* ў в. Завоссе), ці праз выкарыстанне ўстановамі першай і другой груп шляхам уключэння ў турыстычныя маршруты ў якасці аб'ектаў экскурсійнага паказу.

***Глава 3 «Актуалізацыя сядзібна-паркавых комплексаў: сучасны стан і перспектывы»*** ўтрымлівае аналіз разнастайных кірункаў і фактараў, якія ўплываюць на функцыянаванне гісторыка-культурнай спадчыны і яе актуалізацыю ў сучаснай культурнай прасторы.

У ***раздзеле 3.1 «Мемарацыя сядзібна-паркавых комплексаў у Рэспубліцы Беларусь як кірунак фарміравання гістарычнай і культурнай памяці грамадства»*** падкрэсліваецца, што мемарацыя як важны кампанент культуры памяці дазваляе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мэтанакіравана і найбольш поўна актуалізаваць сродкамі музейнай дзейнасці аксіялагічнае і мемарыяльнае значэнне сядзібна-паркавых комплексаў.

Рэвіталізацыя сядзібна-паркавых комплексаў адбываецца ў залежнасці ад вырашаемых дзяржаўнымі органамі і музейнымі ўстановамі задач і можа складацца з некалькіх узаемазвязаных этапаў: аднаўленне сядзібнага дома і гаспадарчых збудаванняў; узнаўленне помнікаў садова-паркавага мастацтва на тэрыторыі, дзе размяшчалася сядзіба; захаванне, рэстаўрацыя або рэканструкцыя сядзібнага культурнага ландшафту на пэўны момант часу ў мінулым; вызначэнне сувязі сядзібна-паркавага комплексу з сацыякультурным развіццём сучаснага грамадства; папулярызацыя і інтэрпрэтацыя сядзібна-паркавых комплексаў ў інфармацыйнай прасторы і сродкамі музейнай і турысцкай дзейнасці; стварэнне навукова-метадычнага цэнтра па вывучэнні сядзібнай культуры пэўнай мясцовасці. Усе адзначаныя кірункі па актуалізацыі сядзібна-паркавых комплексаў садзейнічаюць падтрыманню гістарычнай і культурнай памяці грамадства.

Для ўзнаўлення і ажыўлення культурнай прасторы сядзібна-паркавых комплексаў уяўляецца магчымым і эфектыўным прызнаваць іх у якасці ахоўных гісторыка-культурных і прыродных тэрыторый, што адпавядае сучаснай дзяржаўнай палітыцы і карэліруе з дзеючым заканадаўствам. У Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб культуры акрэслены наступныя віды рамонтна-рэстаўрацыйных работ, накіраваныя на рэвіталізацыю сядзібна-паркавых комплексаў: аднаўленне; дапаўненне; кансервацыя; прыстасаванне; перамяшчэнне; рамонт; раскрыццё; рэгенерацыя; рэканструкцыя; рэстаўрацыя.

Адзначаецца, што музеефікаваныя сядзібныя комплексы з'яўляюцца асновай фарміравання культурна-гістарычнага асяроддзя рэгіёна, ідэнтыфікацыі лакальнага соцыуму, патрыятычнага выхавання. Як помнікі гісторыі, культуры, сацыяльнай традыцыі яны зберагаюць памяць аб падзеях мінулага, што дазваляе раскрыць значэнне рэгіянальнай культуры ў больш шырокім маштабе.

У ***раздзеле 3.2 «Музейная прэзентацыя сядзібнай прасторы як носьбіта культурнай інфармацыі»*** адзначаецца, што галоўнай умовай актуалізацыі помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны з'яўляецца яе музеефікацыя, пры дапамозе якой сядзібна-паркавыя комплексы пераўтвараюцца ў музеі мемарыяльнага ці краязнаўчага профілю, або аддаюцца пад музейнае выкарыстанне з адпаведнымі іх профілю зменамі. Беларускімі музеямі выпрацаваны прынцыпы і метады музеефікацыі і прэзентацыі нерухомай культурнай спадчыны, заснаваныя на спробах мемарыялізацыі жыцця і дзейнасці пэўнай асобы.

Стварэнне музея на тэрыторыі сядзібы носіць комплексны характар. Падрыхтоўка да яе музеефікацыі пачынаецца са збору архіўнага матэрыялу, звязанага з гісторыяй заснавання і пазнейшых перабудоў, архітэктурай, колам людзей, якія жылі, або так ці інакш мелі адносіны да сядзібнага дома. Важнейшым этапам пры стварэнні музеяў-сядзіб з'яўляецца камплектаванне фондаў і выбар музейных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадметаў і экспазіцыйных матэрыялаў, якія будуць напаўняць мемарыяльную прастору музея і складуць аснову будучай экспазіцыі.

У сядзібным доме, як правіла, захоўваецца або ўзнаўляецца інтэр’ер жылога дома і ствараюцца гісторыка-біяграфічныя экспазіцыі, ажыццяўляюцца спробы аднаўлення парку, надворных будынкаў, малых архітэктурных форм і г. д. (*Лошыцкі сядзібна-паркавы комплекс*, *музей-сядзіба Міцкевічаў «Завоссе»* і інш.). Аднак асобныя сядзібы набываюць іншае функцыянальнае прызначэнне – напрыклад, выкарыстоўваюцца пад музеі краязнаўчага профілю (Хойніцкі раённы краязнаўчы музей у былой *сядзібе купцоў Аўрамавых*; Пухавіцкі раённы краязнаўчы музей у *сядзібным доме А. В. Бонч-Асмалоўскага* і інш.) і фактычна страчваюць аўтэнтычнае значэнне.

У ***раздзеле 3.3 «Перспектывы актуалізацыі і папулярызацыі сядзібна-паркавых комплексаў»*** звяртаецца ўвага на выключнае значэнне трансляцыі культурнай памяці сродкамі турысцкай індустрыі. Пры выкарыстанні гістарычных сядзіб пад патрэбы турысцка-экскурсійнай дзейнасці неабходна ўлічваць не толькі навуковую і мастацкую каштоўнасць аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, але і іх духоўна-патрыятычную прыцягальнасць для наведвальнікаў-экскурсантаў. Прывабнасць сядзібна-паркавага комплексу павялічвае турыстычны паток, і частка атрыманых ад гэтага віду дзейнасці сродкаў можа быць выкарыстана на яго далейшае ўтрыманне.

Аўтарам даследавання распрацаваны крытэрыі ацэнкі турыстычнага патэнцыялу таго ці іншага сядзібна-паркавага комплексу шляхам спалучэння дадзеных Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь (мастацкая каштоўнасць), партала «Глобус Беларусі» (рэйтынг цікавасці да аб’екта), а таксама сістэматызацыі, прапанаванай у дысертацыйнай рабоце, абапіраючыся на якія магчыма вылучыць перспектыўныя аб’екты ў справе актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны, рэалізаваць на практыцы іх каштоўнасны змест, паказаць магчымасць пераемнасці традыцый.

У дысертацыйнай рабоце адзначаецца важнасць выкарыстання сучасных крыніц камунікацыі, у тым ліку сацыяльных сетак, пры папулярызацыі матэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны. Інтэрнэт-рэсурсы дазваляюць асвятляць, прасоўваць культурна-адукацыйную і навукова-даследчую дзейнасць музеяў, прыцягваць увагу да праблем аховы аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны (напрыклад, сайт *Цэнтра экалагічнага турызму «Станькава»*).

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Сядзібна-паркавыя комплексы, росквіт якіх прыпадае на XIX – пачатак XX ст., з’яўляюцца найбольш выразнымі культурнымі і эканамічнымі ўтварэннямі краіны, рэгіёна або пэўнай мясцовасці. Складаныя ансамблі архітэктурных і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыродна-ландшафтных элементаў у сукупнасці ўтвараюць своеасаблівыя лакальныя аб’яднанні, якія фарміруюць культурна-гістарычнае асяроддзе, спрыяюць ідэнтыфікацыі соцыуму. У выніку працяглага гісторыка-культурнага сінтэзу сядзібна-паркавы комплекс складваецца не толькі як форма эканамічнага і сацыяльнага жыцця пэўнай мясцовасці, а як своеасаблівая культурная прастора.

Узнікненне шляхецкіх сядзіб на тэрыторыі Беларусі было звязана з пераменамі ў ідэалагічнай праграме шляхты, яе пераходам да «арганічнай працы» і ростам эканамічных магчымасцей, сацыяльна-псіхалагічнымі ўстаноўкамі на перайманне ладу жыцця кіруючай эліты, дэманстрацыю грамадскага статусу свайго роду. Фарміраванне мастацкіх асаблівасцей беларускіх сядзібна-паркавых комплексаў адбывалася ў рэчышчы развіцця агульнаеўрапейскай культуры з улікам мясцовых традыцый, гістарычных і сацыяльна-эканамічных умоў, а таксама маральных норм паўсядзённага жыцця, эстэтычных густаў іх уладальнікаў.

Пад сядзібай звычайна разумеецца адзінкавы помнік, які складаецца з *комплексу жылых, гаспадарчых пабудоў і помнікаў садова-паркавага мастацтва*. Паняцце «сядзібна-паркавы комплекс» больш шырокае і разглядае дадзены гісторыка-культурны феномен як частку *культурнага ландшафту, дзе спалучаюцца помнікі сядзібнай архітэктуры і садова-паркавага мастацтва пэўнай мясцовасці, значныя для захавання і прэзентацыі гісторыка-культурнай спадчыны свету, краіны або рэгіёна.* Увядзенне паняцця «культурны ландшафт» дазваляе акцэнтаваць ўвагу на інфармацыйным, аксіялагічным, экалагічным патэнцыяле помніка, здабытках матэрыяльнай і духоўнай культуры ўладальнікаў сядзіб, што адлюстроўвае сацыякультурны стан тагачаснага грамадства [3; 4; 8].

2. Праблемы захавання, вывучэння, прэзентацыі гісторыка-культурнай спадчыны, як паказвае выпрацаваная на працягу стагоддзяў практыка, цесна звязаны з музеефікацыяй, якая заключаецца ў пераўтварэнні гісторыка-культурных або прыродных аб’ектаў у аб’екты музейнага паказу з мэтай максімальнага захавання і вызначэння іх гісторыка-культурнай, навуковай, мастацкай і сацыяльнай каштоўнасці. Музеефікацыі прапярэднічае шэраг мерапрыемстваў па даследаванні помніка, яго кансервацыі і рэстаўрацыі, захаванні ці аднаўленні мастацка-архітэктурнага, гісторыка-культурнага асяроддзя, арганізацыі ўмоў для агляду і г. д. Музеефікацыя як адзін з кірункаў актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі завяршае доўгатэрміновы працэс рэвіталізацыі матэрыяльнай нерухомай спадчыны.

У сучасных сацыякультурных рэаліях механічнае прыстасаванне помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны пад любую экспазіцыю адыходзіць на другі план і пераважае погляд на неабходнасць раскрыцця індывідуальных асаблівасцей і гісторыка-культурнай каштоўнасці аб’екта. Гэта павінна стаць абавязковай умовай музеефікацыі. Усё складаней правесці мяжу паміж дэманстрацыяй помніка як самастойнага аб’екта паказу і выкарыстаннем яго пад экспазіцыю, калі апошняя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

храналагічна і стылістычна адпавядае рэканструкцыі цэласнага гісторыка-культурнага і мастацкага вобраза. Для прыстасаваных пад сучаснае выкарыстанне сядзібна-паркавых комплексаў уяўляецца магчымым і эфектыўным прынцып іх развіцця як ахоўных гісторыка-культурных і прыродных тэрыторый [1; 4; 5; 8].

3. Сучасны стан сядзібна-паркавых комплексаў на тэрыторыі Беларусі неад’емна звязаны з сацыяльна-эканамічнай, ідэалагічнай і культурнай эвалюцыяй грамадства. Менавіта ідэалагічныя погляды аказалі вызначальны ўплыў на стаўленне грамадства да матэрыяльнай і духоўнай спадчыны дарэвалюцыйнага перыяду і з’явіліся прычынай згубы многіх непаўторных помнікаў культуры. Гэта праявілася ў тым ліку ў разбурэнні і скарачэнні агульнай колькасці сядзібна-паркавых комплексаў, што выразна адлюстроўвае адносіны да непрызнаных уладай помнікаў матэрыяльнай нерухомай спадчыны. Перамены ў беларускім грамадстве пасля набыцця суверэнітэту садзейнічалі замацаванню паняцця «спадчына», рэнавацыі яе відаў і форм.

Сістэматызацыя сядзібна-паркавых комплексаў на тэрыторыі краіны ўзбагачае сферу інтарэсаў музейнай навукі, пашырае кола аб’ектаў для стварэння самастойных музеяў, а таксама звяртае ўвагу грамадства на праблемы функцыянавання помнікаў сядзібна-паркавага мастацтва ў сучаснай сацыякультурнай прасторы і неабходнасць іх актуалізацыі.

На падставе аналізу класіфікацый помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны (на дзяржаўным і прыватным узроўнях) выпрацаваны аўтарскі падыход да сістэматызацыі сядзібна-паркавых комплексаў, які ўлічвае як навуковую каштоўнасць аб’екта, так і ступень яго захаванасці і прыстасаванасці пад задавальненне духоўных патрэб грамадства, а галоўнае – магчымасць іх прэзентацыі як аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны для шырокага ўключэння ў актуальную культуру.

Праведзенае даследаванне паказала, што ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь на 2014 г. уключаны 173 сядзібна-паркавыя комплексы. Рэйтынгавая сістэматызацыя, прапанаваная стваральнікам інтэрнэт-партала «Глобус Беларусі», аперыруе 1110 адзінкамі азначаных помнікаў гісторыі і культуры.

Згодна з аўтарскай сістэматызацыяй вылучаюцца тры группы аб’ектаў музеефікацыі і далейшай актуалізацыі:

– сядзібы, прыдатныя для актуалізацыі былых пластоў матэрыяльнай і духоўнай культуры, на аснове якіх можна стварыць (ці ўжо створаны) музеі;
– помнікі са значным гісторыка-культурным патэнцыялам, якія могуць быць уключаны ў сферу музейных інтарэсаў ці індустрыі турызму, аднак патрабуюць значных фінансавых капіталаўкладанняў для рэстаўрацыі і аднаўлення;
– сядзібна-паркавыя комплексы, якія не дайшлі да нашага часу ці захаваліся ў фрагментарным, руініраваным выглядзе, але могуць быць выкарыстаны ў якасці аб’ектаў музейнага паказу [2; 9; 10].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Вызначэнне фактараў актуалізацыі сядзібна-паркавых комплексаў на тэрыторыіі Беларусі, такіх як *спрыяльнае сацыяльна-культурнае асяроддзе, актывізацыя ролі дзяржавы і грамадскіх ініцыятыў, асветніцкай дзейнасці, адраджэнне традыцый, гістарычнай і культурнай памяці, комплекснае выкарыстанне форм і метадаў музеефікацыі матэрыяльнай нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны*, дазволіла зрабіць выснову, што музеефікацыя з’яўляецца важнейшым *традыцыйным кірункам* і адначасова галоўнай умовай актуалізацыі і папулярызацыі назапашанага інфармацыйнага патэнцыялу помнікаў сядзібна-паркавага мастацтва. *Традыцыйнай формай* актуалізацыі сядзібна-паркавага комплексу з’яўляецца яго выкарыстанне «пад музей» ці «як музей», што праяўляецца ў захоўванні або ўзнаўленні ў блізкіх храналагічных рамках інтэр’ера жылога дома, стварэнні гісторыка-біяграфічных экспазіцый, аднаўленні парку і да т. п. Аднак нярэдка асобныя сядзібы выкарыстоўваюцца пад музеі краязнаўчага профілю ці прыстасоўваюцца пад грамадскія ўстановы, што вядзе да страты іх аўтэнтычнасці.

У апошні час арганізацыя музея на тэрыторыі такога сінкрэтычнага ўтварэння, як сядзібна-паркавы комплекс, набывае інавацыйны характар, што ўвасабляецца ў эвалюцыі традыцыйных музейных форм, іх пераўтварэнні ў асяродкавыя музеі. Дзейнасць такіх музеяў грунтуецца на аснове музеефікацыі гісторыка-культурнага і (або) прыроднага асяроддзя з яго рухомымі, нерухомымі, жывымі і нематэрыяльнымі аб’ектамі і існуючымі паміж імі ўзаемасувязямі.

*Перспектыўным кірункам* актуалізацыі шляхецкіх сядзіб з’яўляецца турысцка-экскурсійная дзейнасць. Ацэнка турыстычнага патэнцыялу сядзібна-паркавых комплексаў, якая грунтуецца на спалучэнні дадзеных з Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь (навуковая і мастацкая каштоўнасць), партала «Глобус Беларусі» (рэйтынг цікавасці да аб’екта), аўтарскага даследавання (магчымасць музеефікацыі; улік транспартнай даступнасці, узровень развіцця турыстычнай інфраструктуры) дазваляе вылучыць аптымальныя аб’екты для ўключэння ў актуальную сацыякультурную прастору. Мае значэнне не толькі цікавасць навукоўцаў да пэўнага помніка гістарычнай, культурнай, мастацкай спадчыны, але і яго сэнсавае, каштоўнаснае напаўненне, інфармацыйны патэнцыял, якія транслююцца ў актуальную культуру і ахопліваюць шырокія пласты грамадства.

Пры актуалізацыі матэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны важная роля належыць найноўшым крыніцам камунікацыі. Такія інтэрнэт-рэсурсы, як Вконтакте, Instagram, Twitter, Facebook, акумулююць вялікую колькасць карыстальнікаў і дазваляюць праводзіць маркетынгавыя мерапрыемствы для аналізу і прыцягнення мэтавай аўдыторыі, а таксама маюць шырокі функцыянал для размяшчэння інфармацыйнага кантэнту.

Сучасныя кірункі рэвіталізацыі сядзібна-паркавых комплексаў, ад кансервацыі да музеефікацыі, не будуць мець перспектыў без актуалізацыі і інтэрпрэтацыі іх гісторыка-культурнай, мастацкай і духоўнай каштоўнасці, якая павінна грунтавацца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на выкарыстанні шырокага спектра традыцыйных і новых падыходаў. Музей, экскурсійная дзейнасць, а таксама краязнаўчы рух праз актуалізацыю гісторыка-культурнай спадчыны могуць абудзіць глыбокую зацікаўленасць грамадства ў справе захавання сядзібна-паркавых комплексаў. Пры рэвіталізаваных сядзібах мэтазгодна ўжываць сацыякультурныя тэхналогіі, а менавіта: ствараць традыцыйную вытворчасць на базе аўтэнтычных рамёстваў, арганізоўваць мерапрыемствы, прысвечаныя гісторыі краю ці мясцовым вядомым дзеячам, праводзіць фестывалі, тэатралізаваныя відовішчы і г. д. [3; 5; 6; 7; 9].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Фактычны матэрыял даследавання ўвайшоў у аўтарскі курс лекцый «Музеефікацыя помнікаў матэрыяльнай культуры», «Турыстычны патэнцыял Беларусі», вучэбную праграму «Геаграфія турызму» па дысцыплінах спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках). Практычная значымасць атрыманых вынікаў пацвярджаецца актамі ўкаранення (ад 27.12.2017, 14.03.2018).

Высновы, сфармуляваныя ў выніку даследавання, могуць знайсці прымяненне пры вырашэнні актуальных тэарэтычных і практычных праблем музеязнаўства, звязаных з музеефікацыяй сядзібна-паркавых комплексаў на тэрыторыі Беларусі. Асноўныя вынікі даследавання, фактычны матэрыял могуць выкарыстоўвацца ў курсах айчыннай гісторыі музейнай справы, спецкурсах па музеязнаўстве, культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў, пры распрацоўцы музеязнаўчых праграм, у турысцкай і краязнаўчай дзейнасці, а таксама пры падрыхтоўцы турыстычных маршрутаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

## Артыкулы ў навуковых рэцэнзаваных выданнях

1. Герасімѐнак, Д. В. Сутнасць музеефікацыі: генезіс і эвалюцыя / Д. В. Герасімѐнак // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2016. – № 2 (26). – С. 167–174.

2. Герасімѐнак, Д. В. Класіфікацыя сядзібна-ландшафтных комплексаў на тэрыторыі Віцебскай вобласці: неабходнасць новых падыходаў / Д. В. Герасімѐнак // Искусство и культура. – 2017. – № 2 (26). – С. 56–60.

3. Герасімѐнак, Д. В. Перспектывы захавання і прэзентацыі сядзібна-ландшафтных комплексаў як часткі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі / Д. В. Герасімѐнак // Роднае слова. – 2017. – № 7 (355). – С. 81–84.

## Артыкулы ў навуковых зборніках

4. Герасімѐнак, Д. В. Музеефікацыя архітэктурна-прыродных комплексаў на тэрыторыі Беларусі / Д. В. Герасімѐнак // Інтэрпрэтацыя сімвала ў нацыянальнай культуры : XXXIX навук. канф. студ., магістр., аспір. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў (26 сак. 2014 г.) : зб. навук. арт. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдсавет: В. Р. Языковіч (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2015. – С. 20–24.

5. Герасімѐнак, Д. В. Адлюстраванне падзей Вялікай Айчыннай вайны ў экспазіцыях, прыстасаваных пад музеі былых сядзіб / Д. В. Герасімѐнак // Культура. Наука. Творчество = Культура. Навука. Творчасць = Culture. Science. Arts : IX Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 5 мая 2015 г. : сб. науч. ст. / М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств [и др.] ; науч. ред. В. Р. Языкович. – Минск, 2016. – С. 68–72.

6. Герасімѐнак, Д. В. Культурны турызм як сродак захавання і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны / Д. В. Герасімѐнак // Культура. Наука. Творчество = Культура. Навука. Творчасць = Culture. Science. Arts : X Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 12 мая 2016 г. : сб. науч. ст. / М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств [и др.] ; науч. ред. В. Р. Языкович. – Минск, 2016. – С. 129–133.

7. Герасімѐнак, Д. В. Інфармацыйны патэнцыял гісторыка-культурнай спадчыны роду Тышкевічаў / Д. В. Герасімѐнак // Гісторыка-культурная спадчына Свіслацкага краю (да 760-годдзя горада Свіслач) : зб. арт. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, Ін-т гісторыі НАН Беларусі, Свіслац. райвыканкам ; рэдкал.: А.І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2018. – С. 14–18.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

8. Герасімѐнак, Д. В. Музеефікацыя архітэктурна-прыродных комплексаў як адбітак духоўнага стану грамадства / Д. В. Герасімѐнак // Матэрыялы XX Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытанняў, прысвечаных Дням славянскага пісьменства і культуры, Мінск, 20–23 мая 2014 г. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: В. Р. Языковіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 68–71.

9. Герасімѐнак, Д. В. Праблемы музеефікацыі сядзіб на тэрыторыі Беларусі: стан і перспектывы / Д. В. Герасімѐнак // Асоба ў кантэксце сучасных сацыякультурных працэсаў : матэрыялы I Міжнар. навук. канф. памяці Я. Д. Грыгаровіч, Мінск, 12 лістап. 2014 г. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: В. Р. Языковіч (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2015. – С. 387–393.

10. Герасімѐнак, Д. В. Музеефікацыя архітэктурна-ландшафтных комплексаў: праблемы вызначэння класіфікацыі / Д. В. Герасімѐнак // Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва : матэрыялы навук. канф., Мінск, 28 лістап. 2014 г. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: Ю. П. Бондар (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 73–77.

**Вучэбна-метадычныя і іншыя матэрыялы**

11. Герасімѐнак, Д. В. Геаграфія турызму : вучэбная праграма па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад. Д. В. Герасімѐнак. – Мінск : БДУКМ, 2018. – 16 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# РЭЗЮМЭ

## ГЕРАСІМЁНАК ДЗМІТРЫЙ ВАСІЛЬЕВІЧ

## МУЗЕЕФІКАЦЫЯ СЯДЗІБНА-ПАРКАВЫХ КОМПЛЕКСАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЯК СРОДАК АКТУАЛІЗАЦЫІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

**Ключавыя словы**: музей-сядзіба, музеефікацыя, матэрыяльная нерухомая гісторыка-культурная спадчына, сядзібна-паркавы комплекс, помнік сядзібна-паркавага мастацтва, ахова гісторыка-культурнай спадчыны, актуалізацыя спадчыны.

**Мэта даследавання** – вызначэнне перспектыўных напрамкаў актуалізацыі сядзібна-паркавых комплексаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

**Метады даследавання**: агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя), гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалагічны, назіранне.

**Вынікі даследавання і іх навізна**. У дысертацыйным даследаванні падаецца сістэмнае вывучэнне сядзібна-паркавых комплексаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Вызначаюцца і ўдакладняюцца змест і судносіны паняццяў «музей-сядзіба», «сядзібна-паркавы комплекс», «помнік сядзібна-паркавага мастацтва» ў арганізацыйна-інфармацыйнай сістэме матэрыяльнай нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны. Раскрыты эвалюцыя, асноўныя напрамкі, прынцыпы аховы і музеефікацыі матэрыяльнай нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны. Сабраны аўтарам даследавання матэрыял дазволіў ахарактарызаваць сучасны стан сядзібна-паркавых комплексаў на тэрыторыі Беларусі і прапанаваць універсальны падыход да іх сістэматызацыі. Аналіз актуальнага выкарыстання сядзібна-паркавых комплексаў адлюстраваў існуючыя формы і метады інтэрпрэтацыі і прэзентацыі культурнай прасторы сядзіб. Вылучаны перспектыўныя напрамкі актуалізацыі і папулярызацыі сядзібнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні**. Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць выкарыстоўвацца ў курсах айчыннай гісторыі музейнай справы, спецкурсах па музеязнаўстве, культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў, пры распрацоўцы музеязнаўчых праграм, у турысцкай і краязнаўчай дзейнасці, а таксама пры падрыхтоўцы турыстычных маршрутаў. Навуковыя палажэнні і высновы дысертацыі спрыяюць пашырэнню праблемнага поля музеязнаўства і могуць стаць асновай для далейшых музеязнаўчых, сацыякультурных і мастацтвазнаўчых даследаванняў.

**Галіна ўжывання**: тэорыя і гісторыя культуры, музеязнаўства, ахова гісторыка-культурнай спадчыны, гісторыя Беларусі, мастацтвазнаўства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЕЗЮМЕ

## ГЕРАСИМЕНОК ДМИТРИЙ ВАСИЛЬЕВИЧ

## МУЗЕЕФИКАЦИЯ УСАДЕБНО-ПАРКОВЫХ КОМПЛЕКСОВ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ КАК СРЕДСТВО АКТУАЛИЗАЦИИ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ

**Ключевые слова**: музей-усадьба, музеефикация, материальное недвижимое историко-культурное наследие, усадебно-парковый комплекс, памятник усадебно-паркового искусства, охрана историко-культурного наследия, актуализация наследия.

**Цель исследования** – определение перспективных направлений актуализации усадебно-парковых комплексов на территории Республики Беларусь.

**Методы исследования**: общенаучные (анализ, синтез, дедукция, индукция), историко-генетический, историко-типологический, наблюдения.

**Результаты исследования и их новизна.** В диссертационном исследовании предлагается системное изучение усадебно-парковых комплексов на территории Республики Беларусь. Определяются и уточняются содержание и соотношение понятий «музей-усадьба», «усадебно-парковый комплекс», «памятник усадебно-паркового искусства» в организационно-информационной системе материального недвижимого историко-культурного наследия. Раскрыты эволюция, основные направления, принципы охраны и музеефикации материального недвижимого историко-культурного наследия. Собранный автором исследования материал позволил охарактеризовать современное состояние усадебно-парковых комплексов на территории Беларуси и предложить универсальный подход к их систематизации. Анализ актуального использования усадебно-парковых комплексов отразил существующие формы и методы интерпретации и презентации культурного пространства усадеб. Обозначены перспективные направления актуализации и популяризации усадебного наследия Республики Беларусь.

**Рекомендации по использованию**. Результаты диссертационного исследования могут использоваться в курсах отечественной истории музейного дела, спецкурсах по музееведению, культурно-образовательной деятельности музеев, при разработке музееведческих программ, в туристской и краеведческой деятельности, а также при подготовке туристических маршрутов. Научные положения и выводы диссертации способствуют расширению проблемного поля музееведения и могут стать основой для дальнейших музееведческих, социокультурных и искусствоведческих исследований.

**Область применения**: теория и история культуры, музееведение, охрана историко-культурного наследия, история Беларуси, искусствоведение.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## SUMMARY

## DMITRY GERASIMENAK

## MUSEIFICATION OF MANOR AND PARK COMPLEXES OF THE REPUBLIC OF BELARUS AS A MEAN OF ACTUALIZATION OF HISTORICAL AND CULTURAL HERITAGE

**Key words**: museum-estate, museumification, immovable cultural heritage, manor and park complex, monument of manor and park art, protection of cultural heritage, actualization of heritage.

**Research purpose**: determination of perspective directions of actualization of manor and park complexes on the territory of the Republic of Belarus.

**Research methods**: general scientific (analysis, synthesis, induction, deduction), historical-genetic, historical-typological, observation.

**The results of the research and their scientific novelty**. The dissertation research offers system study of manor and park complexes on the territory of the Republic of Belarus. The notions “museum-estate”, “manor and park complex”, “monument of manor and park art” are determined and defined in the organizational and information system of immovable cultural heritage. The evolution, main directions, principles of protection and museification of immovable cultural heritage have been reflected. The collected by the author of the research material have made it possible to characterize the present state of manor and park complexes on the territory of Belarus and to offer a universal approach to their systematization. Analysis of the actual use of manor and park complexes have been reflected the existing forms and methods of interpretation and presentation of the estate cultural space. Perspective directions of actualization and popularization of the estate heritage of the Republic of Belarus have been indicated.

**Practical application**. The results of the dissertation research can be used in the lectures of the history of the museum studies in Belarus, special courses in museology, cultural and educational activities of museums, in the development of museum programmes, in tourism and local lore activities, and in the development of tourist routes. The scientific provisions and conclusions of the thesis contribute to the expansion of the problem field of museology and can become the basis for further museological, sociocultural and art studies.

**Scope**: Theory and History of culture, Museum Science, Protection of Historical and Cultural Heritage, History of Belarus, Art history.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковае выданне

**Герасімѐнак Дзмітрый Васільевіч**

**Музеефікацыя сядзібна-паркавых комплексаў Рэспублікі Беларусь як сродак актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны**

**Аўтарэферат**
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата культуралогіі па спецыяльнасці
24.00.03 – музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя
гісторыка-культурных аб'ектаў

РЕПОЗИТОРИИ БГУКИ

Падпісана ў друк 02.05.2018. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Надрукавана на рызографе.
Ум. друк. арк. 1,39. Ул.-выд. арк. 1,54.
Тыраж 60 экз. Заказ № 407.

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск
ЛП №02330/456 ад 23.01.2014.